ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА»
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйны веснік

ЛЮТЫ

Віцебск
2012

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Люты

Інфармацыйны веснік

2012 г.

Складальнік А. М. Васілеўская
Рэдактар В. М. Нявейкава
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатава
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Надрукавана на ксераксе
ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна"
210601, г. Віцебск, Леніна, 8-а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by.

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Люты

Інфармацыйны веснік

ВІЦЕБСК, 2012

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К 90

Складальнік А. М. Васілеўская
Рэдактар В. М. Нявейкава
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатава
Адказны за выпуск А. І. Сёмкін

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : люты : інфармацыйны веснік / ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2012. – 20 с.

Штомесячны інфармацыйны веснік разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначаны для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ "Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна", 2012 г.

45 гадоў – У. Дубоўка "Жоўтая акацыя" (1967)

40 гадоў – В. Быкаў "Абеліск" (1972)
40 гадоў – В. Быкаў "Сотнікаў" (1972)
40 гадоў – У. Караткевіч "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (1972)

35 гадоў – У. Караткевіч "Зямля пад белымі крыламі" (1977**)**

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 г. № 618 2012 год аб'яўлены Годам кнігі. Такое рашэнне прынята ў мэтах павышэння ролі кнігі і чытання ў сучасным грамадстве, выхавання ў маладога пакалення любові да мастацкага слова, развіцця айчыннай літаратуры, забеспячэння дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнага кнігавыдавецтва.

Распрацавана і зацверджана сімволіка Года кнігі. Эмблема ўяўляе сабой раскрытую кнігу, у афармленні якой выкарыстаны элементы беларускай сімволікі.

Кнігі-юбіляры беларускіх пісьменнікаў 2012 года

90 гадоў – Я. Купала "Спадчына" (1922)
90 гадоў – М. Чарот "Босыя на вогнішчы" (1922)
90 гадоў – М. Чарот "Завіруха" (1922)

85 гадоў – Я. Колас "У глыбі Палесся" (1927)
85 гадоў – Я. Купала "Магіла льва" (1927)
85 гадоў – Я. Маўр "Чалавек ідзе" (1927)

80 гадоў – Я. Колас "Адшчапенец" (1932)
80 гадоў – А. Куляшоў "Па песню, па сонца!" (1932)
80 гадоў – К. Чорны "Бацькаўшчына" (1932)

75 гадоў – М. Лынькоў "Міколка-паравоз" (1937)
75 гадоў – М. Лынькоў "Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў" (1937)

65 гадоў – Я. Колас "Рыбакова хата" (1947)
65 гадоў – М. Танк "Кніжка пра мядзведзя" (1947)

55 гадоў – М. Танк "След бліскавіцы" (1957)

50 гадоў – В. Быкаў "Здрада" (1962)
50 гадоў – В. Быкаў "Трэцяя ракета" (1962)
50 гадоў – М. Танк "Мой хлеб надзённы" (1962)

ЗМЕСТ

ПРАДМОВА……4

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ
Культурнае жыццё Віцебскай вобласці: інфармацыйнае паведамленне……..5

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ
2012 – Год кнігі. Кнігі-юбіляры беларускіх пісьменнікаў 2012 года.....18

ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячны інфармацыйны веснік, разлічаны на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных і музейных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 па 29 лютага 2012 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, атрыманыя з ДУ “Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна”», аддзела культуры Міёрскага райвыканкама, Віцебскага АМЦНТ, Бешанковіцкай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Дубровенскай, Лёзненскай, Пастаўскай, Ушацкай, Шаркаўшчынскай раённых сетак бібліятэк, Віцебскай і Полацкай гарадскіх сетак бібліятэк.

Рубрыка “У цэнтры ўвагі” прысвечана Году кнігі, аб’яўленаму Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2011 года.

Віцебскі АМЦНТ

Витебский проспект. – 2012. – 23 февр. – С. 23.

У Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур г. Полацка адкрылася выстава, на якой прадстаўлена творчасць *Зінаіды* і *Генадзя Лёціных* (выцінанка, апрацоўка дрэва).

Полацкі веснік. – 2012. – 17 лют. – С. 4.

- *ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ*

22 лютага на камернай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа адбыўся вечар, падрыхтаваны да юбілейнага дня нараджэння і 50-годдзя творчай дзейнасці на коласаўскай сцэне артысткі, асістэнта рэжысёра *Людмілы Аляксандраўны Заграбельнай.*

Народнае слова. – 2012. – 18 лют. – С. 7.

Витебский проспект. – 2012. – 23 февр. – С. 22.

МЕРАПРЫЕМСТВЫ, ЯКІЯ НЕ ЎВАЙШЛІ Ў ПАПЯРЭДНІ ВЫПУСК

20 студзеня ў Калінкаўскім сельскім Доме культуры прайшоў чарговы раённы семінар для работнікаў культуры ”Роля ўстаноў культуры ў адраджэнні нацыянальных традыцый і абрадаў. Святы народнага календара”.

Дняпроўская праўда. *– 2012. – 1 лют. – С. 3.*

26 студзеня на сцэне ДК чыгуначнікаў адбылася прэм’ера спектакля “Две стрелы” па п’есе Аляксандра Валодзіна, рэжысёр спектакля – *Ігар Баярынцаў*. У здзяйсненні праекта прынялі ўдзел два калектывы – маладзёжны тэатр Дома культуры чыгуначнікаў і шоу-балет “Сенсацыя”.

Витебский проспект. – 2012. – 2 февр. – С. 20.

У канцы **студзеня** ў глыбоцкім Доме рамёстваў адкрылася выстава работ *Пятра Іосіфавіча Адахоўскага*, якія выкананы ў розных тэхніках разьбы па дрэве “Самобытные фантазии”.

Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 1 лют. – С. 4.

Народнае слова. – 2012. – 7 лют. – С. 7.

Витебский проспект. – 2012. – 9 февр. – С. 23.

Сучасны беларускі фарфор прадстаўляе выстава *Людмілы і Валерыя Кавальчукоў* “ArterrA”, якая адкрылася ў Мастацкім музеі Віцебска. Сярод 193 прадметаў - дэкаратыўныя вазы, сервізы, кампазіцыі, пано… Мастакі адрадзілі стражытную традыцыю роспісу па сырой гліне, якая існавала ў XVII-XVIII стагоддзях і называлася віцебскай маёлікай, менавіта роспісу Людміла надае больш увагі, удасканальвае тыя формы, якія пакінуў Валерый (заўчасна пайшоў з жыцця ў 2009 годзе).

Витебский проспект.– 2012. – 9 февр. – С. 23.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 февр. – С. 8.

Цэлую галерэю яркіх характарных партрэтаў прадставіў на сваёй персанальнай фотавыставе ”50х50”, якая адкрылася ў абласным краязнаўчым музеі, фотамастак з Полацка *Эрнст Цецярэўскі.*

Витебский проспект. – 2012. – 23 февр. – С. 23.

Рэтраспектыўную выставу “Художник и время” Ганаровага члена Расійскай акадэміі мастацтва, члена Саюза мастакоў СССР і Беларускага саюза мастакоў *Юрыя Панцеляймонавіча Зуева* прадстаўляе Мастацкі музей Віцебска.

Витебский проспект. – 2012. – 16 февр. – С. 22.

16 лютага пайшоў з жыцця адзін са старэйшых віцебскіх мастакоў, член Саюза мастакоў Беларусі *Леанід Сяргеевіч Анцімонаў*.

Витебский проспект. – 2012. – 23 февр. – С. 23.

У Мастацкай галерэі Полацка адбылося адкрыццё выставы твораў удзельнікаў суполкі “Аршыца”, якая аб’ядноўвае мастакоў з Віцебска, Оршы, Мінска і Баранавічаў.

Полацкі веснік. – 2012. – 3 лют. – С. 23.

- *ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА*

10 лютага ў выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрылася абласная выстава фота, паштовак і сувеніраў дэкаратыўна-прыкладнога напрамку “Каханне – гэта мы!”, прымеркаваная да Дня закаханных. На выставе прадстаўлены творы вядомых фотамайстроў *Алега Яроменкі, Дзмітрыя Оськіна* (г. Наваполацк), прафесіяналаў «Дома фатаграфіі “Віцебск”» *Аляксея Вронскага* і *Юрыя Антонава* (г. Віцебск).

14 лютага ў выставачнай зале Віцебскага АМЦНТ адкрылася выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці (бацік, дэкупаж і інш.) *Марыны Шутко* “Якім будзе чалавек без кахання”, прымеркаваная да Дня закаханных, з удзелам навучэнцаў Віцебскай школы мастацтваў № 3 “Маладзік”.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Дзяржаўная ўстанова Цэнтр культуры “Віцебск” стала пераможцай нацыянальнага конкурсу “Брэнд года Беларуси - 2011” у намінацыі “Культура и искусство” за брэнд “Славянский базар в Витебске”.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 2 февр. – С. 1.

Витебский проспект. – 2012. – 2 февр. – С. 2.

Народнае слова. – 2012. – 4 лют. – С. 1.

22 лютага ў ГДК прайшла выніковая нарада работнікаў культуры Шумілінскага раёна, на якой былі падведзены вынікі работы ўстаноў культуры раёна за 2011 год і абмеркаваны асноўныя накірункі дзейнасці на год бягучы.

Ганаровую грамату райвыканкама атрымала сёлета дырэктар Шумілінскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы *Іна Каралёва*. Граматай упраўлення культуры аблвыканкама ўзнагароджаны *Зінаіда Касьянава*, загадчыца Мішкавіцкага СК, і *Наталля Філіпава*, кіраўнік узорнай эстраднай студыі “Асарці” Шумілінскага ГДК.

http://www.shumilino.by/?p=6463

24 лютага адбылася справаздачная нарада работнікаў культуры Лёзненскага раёна па выніках работы 2011 года. Аб сацыяльна-эканамічным стане раёна і, у прыватнасці, аб развіцці культуры і задачах на 2012 год паведаміў старшыня раённага выканаўчага камітэта *І. А. Лаўрыновіч*. Начальнік аддзела культуры *Т. А. Шульган* падвяла вынікі работы ўстаноў культуры за мінулы год і ўзнагародзіла граматамі і прэміямі лепшых працаўнікоў.

Імёны 14 прадстаўнікоў Лепельшчыны ўключаны ў другі том энцыклапедыі “Лучшие люди Беларуси”. Сярод іх кіраўнік аддзела культуры Лепельскага райвыканкама *Тамара Бароха*, дырэктар Стайскай дзіцячай школы мастацтваў традыцыйнай культуры *Вераніка Хомбак*, дырэктар Дома рамёстваў *Алена Барадзейка*.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 28 февр. – С. 3.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА.
САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

- *КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ*

У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася выстава “Кітайскі нацыянальны касцюм”. Экспанаты прадстаўлены пасольствам Кітая ў РБ у сувязі з 20-годдзем устанаўлення дыпламатычных адносін.

Витебский проспект. – 2012. – 9 февр. – С. 23.

У Арт-цэнтры Марка Шагала адкрылася выстава работ вядомага польскага фотамастака *Войцеха Вільчыка* “Невинных глаз не существует”, на якой прадстаўлены ўнікальны збор фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць сучасны стан сінагог Польшчы. Выстава адбылася пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску, з якім Музей Марка Шагала наладзіў супрацоўніцтва.

Народнае слова. – 2012. – 14 лют. – С. 8.

Витебский проспект.– 2012. – 16 февр. – С. 23.

У рамках сумеснага расійска-беларускага праекта “Букет для славянки”, які з пачатку гэтага года рэалізуе Паўлапасадская хусткавая мануфактура і культурна-гістарычны комплекс «Залатое кола горада Віцебска “Дзвіна”» праходзіць выстава аўтарскіх хустак з паўлапасадскай калекцыі “Цветы России”.

Витьбичи=Віцьбічы.– 2012. – 25 февр. – С. 12.

10 лютага ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адбылася сустрэча вучняў пачатковых школ са шведскай пісьменніцай *Юяй Віслендэр,* на якой былі прадстаўлены дзве яе кніжкі – “Малы і Білан” і “Мама Му”.

Народнае слова. – 2012. – 14 лют. – С. 4.

Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва і Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. Масленікава абмяняліся экспазіцыямі. Зараз у Віцебску экспануецца 40 работ 37 мастакоў з Беларусі, Расіі, Польшчы, Славакіі, Малдовы, Украіны, адначасова ў Магілёве адкрылася выстава жывапісу віцебскага мастака *Мікалая Ткачова*.

Народнае слова. – 2012. – 11 лют. – С. 6.

Витебский проспект. – 2012. – 16 февр. – С. 23.

У Аршанскім этнаграфічным музеі прадстаўлена экспазіцыя “Эх, валенки!” з фондаў раённага гісторыка-этнаграфічнага музея г.п. Дрыбін Магілёўскай вобласці.

http://www.vitnews.by

Віцебскі рабочы. – 2012. – 18 февр. – С. 1.

«Коллегиум» - гэта сумесны культурны праект мастакоў Віцебшчыны і Смаленшчыны. Аднайменная выстава ў трэці раз адкрылася ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. Грамыкі.

Народнае слова. – 2012. – 25 лют. – С. 8.

Шумілінская раённая сетка публічных бібліятэк

14 лютага ў чытальнай зале Шумілінскай раённай бібліятэкі прайшла святочная праграма да Дня закаханых “Валентинов день”.

Гадзіна роднай мовы "Далучыся да роднага слова” адбылася ў Светласельскай сельскай бібліятэцы **19 лютага**.

Тэатралізаванае свята “Бывай, Масленіца!” было праведзена Дабейскай сельскай бібліятэкай сумесна з клубам і ААТ “Прыазёрны мір” **26 лютага**.

- *МУЗЕЙНАЯ СПРАВА*

14 лютага ў краязнаўчым музеі Лепеля адбылася прэзентацыя кніг ”Іван Хруцкі” – першага выдання з серыі “Славутыя мастакі Беларусі”. Праект рэалізуе УП «Выдавецтва “Беларусь”» разам з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі ў рамках праграмы “2012 – Год кнігі”.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 18 февр. – С. 5.

14 лютага ў абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. Шмырова адкрылася выстава кніг і паштовак, прысвечаных гісторыі Айчыннай вайны 1812 года.

Народнае слова. – 2012. – 18 лют. – С. 7.

МАСТАЦТВА

- *АРХІТЭКТУРА*

У Наваполацку, на будынку СШ № 3, устаноўлена мемарыяльная дошка, прысвечаная выпускніку гэтай школы, ваеннаму лётчыку *Васілію Васільевічу Шчарбакову*, Герою Савецкага Саюза, удзельніку афганскай вайны.

Народнае слова. – 2012. – 21 лют. – С. 5.

23 лютага ў г.п. Багушэўск Сенненскага раёна адбылося адкрыццё новага помніка. У цэнтры населенага пункту ў памяць пра мужнасць савецкіх воінаў у час Лепельскага контрудару ўстаноўлена дывізіённая пушка Д-44.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 28 февр. – С. 2.

- *ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА*

У Мастацкім музеі г. Віцебска адкрылася выстава работ члена Беларускага саюза мастакоў *Аляксандра Мікалаевіча Гвоздзікава* “Мастерская скульптора”. На экспазіцыі прадстаўлены скульптурныя кампазіцыі, макеты, жывапісныя работы мастака.

Витьбичи=Віцьбічы.– 2012. – 7 февр. – С. 1, 5.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 7 февр. – С. 8.

работнікі і члены раённага аб'яднання "Фітатэрапія".

Вечарына "Такія звыклыя і незнаёмыя рэчы" прайшла ў Багатырскай бібліятэцы **22 лютага** для членаў клуба па інтарэсах "Скарб" сумесна з Багатырскім СДК.

Сенненская раённая сетка публічных бібліятэк

Сенненскай цэнтральнай раённай бібліятэкай для ўдзельнікаў краязнаўчага клуба "Спадчына" ў **лютым** быў падрыхтаваны вечар-партрэт "Беларусь у малюнках Напалеона Орды", прысвечаны 205-годдзю са дня нараджэння мастака.

Выхаванню пачуцця патрыятызму ў школьнікаў садзейнічала гадзіна гісторыі і мужнасці "Любовь к Отечеству сквозь таинство страниц" (да 200-годдзя перамогі ў Айчыннай вайне 1812 года), якую правяла загадчыца Багданаўскай сельскай бібліятэкі.

Традыцыйна ў бібліятэках адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя Дню абаронцаў Айчыны. У форме конкурсу прайшла ваенна-патрыятычная гульня "Мы гатовы Радзіме служыць", падрыхтаваная супрацоўнікамі дзіцячай раённай бібліятэкі. Бібліятэкар Ходцаўскай сельскай бібліятэкі сумесна з Домам культуры падрыхтавала свята "Есть такая профессия…".

Ушацкая раённая сетка публічных бібліятэк

Ва Ушацкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Е. Лось адбыўся вечар-інтэрв'ю да Дня абаронцаў Айчыны "Почетная обязанность – Отчизне служить!".

Гадзіна роднай мовы прайшла ў Вялікадолецкай бібліятэцы, а дзіцячая бібліятэка № 2 запрасіла на вечар адпачынку, прымеркаваны да Дня святога Валянціна "Love is".

Шаркаўшчынская раённая сетка публічных бібліятэк

Вялікасельская бібліятэка правяла агляд па кнізе *У. Рынкевіча* "Ян Лапацінскі", падчас якога было расказана пра нашага малавядомага земляка, грамадскага дзеяча, мастака *Яна Нікадэма Лапацінскага*.

У Ручайскай бібліятэцы ў Дзень роднай мовы прайшла акцыя "Чытаем Купалу і Коласа разам". Адбыліся заняткі ў рамках мэтавай праграмы "Ведаць беларускую кнігу, чытаць і захапляцца". Для бібліятэкараў была падрыхтавана гадзіна цікавай інфармацыі "Малавядомыя факты з жыцця Я. Купалы і Я. Коласа па старонках інтэрнэт-рэсурсаў".

20 лютага ў Публічным цэнтры прававой інфармацыі старшакласнікам СШ № 1 была прапанавана юрыдычная кансультацыя "Уголовная ответственность несовершеннолетних", якую правёў юрыст У. С. *Хлопаў.*

24 лютага ў дзіцячай бібліятэцы адбыўся рыцарскі турнір, прысвечаны Дню абаронцаў Айчыны.

- *КЛУБНАЯ СПРАВА*

6 лютага ў Музычнай гасцінай адбыўся чарговы вечар пад назвай "А пушкинской дороге нет конца…" з цыклу тэматычных юбілейных вечароў, арганізаваных пры падтрымцы аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама і прысвечаных 80-годдзю *Давіда Рыгоравіча Сімановіча.*

Витьбичи=Віцьбічы.– 2012. – 7 февр. – С. 2.
Витебский проспект.– 2012. – 9 февр. – С. 22.
Віцебскі рабочы. – 2012. – 11 февр. – С. 8.

У гарадскім Цэнтры культуры прайшоў юбілейны вечар, прысвечаны 25-годдзю народнага клуба кветкаводаў-аматараў.

Народнае слова. – 2012. – 18 лют. – С. 6.
Витьбичи=Віцьбічы.– 2012. – 28 февр. – С. 4.

Міні-фестываль мастацкай самадзейнасці "Святой Валентин в гостях у первомайцев" сабраў у Культурна-дзелавым цэнтры "Первомайский" г. Віцебска выхаванцаў аддзялення дзённага знаходжання тэрытарыяльных цэнтраў абслугоўвання насельніцтва.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 21 февр. – С. 3.
Витьбичи=Віцьбічы. – 2012. – 21 февр. – С. 4.

Сустрэча пераможцаў конкурсу паэзіі "Я плюс ты", які быў арганізаваны рэдакцыяй газеты "Народнае слова" сумесна з дзіцячай эстраднай студыяй "Альтанка", адбылася ў Культурна-дзелавым цэнтры "Единство" Першамайскага раёна.

Народнае слова. – 2012. – 14 лют. – С. 4.

15 лютага ў выставачную залу "Духаўскі круглік" на сустрэчу з гаражанамі прыйшлі ўдзельнікі народнага клуба гістарычнай рэканструкцыі "Варгенторн" Цэнтра культуры "Віцебск".

Витебский проспект. – 2012. – 23 февр. – С. 3.
Народнае слова. – 2012. – 23 лют. – С. 15.

17 лютага ў глыбоцкім гарадскім Цэнтры культуры адбыліся справаздачныя канцэрты калектываў Глыбоцкай дзіцячай школы мастацтваў і гарадскога Дома культуры.

Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 22 лют. – С. 5.

26 лютага ў браслаўскім Доме культуры прайшла шоу-праграма "Дзве зоркі", у якой прынялі ўдзел лепшыя спевакі і музыканты Браслаўшчыны, а таксама таленавітыя кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый горада.

Браслаўская звязда. – 2012. – 11 лют. – С. 8.

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Шасцігадовая *Вераніка Далгіх* з Верхнядзвінскага раёна прыняла ўдзел у фінале тэлепраекта "Я пою-2". Дзяўчынка стала адзінай прадстаўніцай Віцебскай вобласці з ліку 10 удзельнікаў праекта, які прадаставіў магчымасць праявіць сябе і здзейсніць мары дзецям з шматдзетных і няпоўных сем'яў, а таксама дзіцячых

дамоў.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 4 февр. – С. 1-2.

У Віцебскай абласной філармоніі адбыўся прагляд канцэртных праграм першага тура конкурсу “Зорны шлях”, у якім прынялі ўдзел народныя, заслужаныя і ўзорныя калектывы Віцебска, Бешанковіцкага, Гарадоцкага, Віцебскага і Шумілінскага раёнаў. Гэты праект ажыццяўляюць упраўленне культуры аблвыканкама, абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і тэлекампанія “СКІФ” з мэтай папулярызацыі народнай творчасці.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 7 февр. – С. 8.

Студэнткі ВДУ імя П. М. Машэрава *Вольга Горына* і *Ірына Філатава* сталі ўдзельнікамі праекта тэлеканала АНТ “Академия талантов”.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 25 февр. – С. 4.

- *БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА*

З **20** па **25 лютага** ў абласным Цэнтры павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноў культуры прайшлі заняткі па павышэнні кваліфікацыі бібліятэкараў бібліятэк-філіялаў.

Віцебскі АМЦНТ

Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна

8 лютага ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбыўся творчы вечар гісторыка, дырэктара Музея Марка Шагала *Людмілы Уладзіміраўны Хмяльніцкай.*

Народнае слова. – 2012. – 14 лют. – С. 4.

Витебский проспект. – 2012. – 16 февр. – С. 3.

Віцебскі рабочы. – 2012. – 23 февр. – С. 16.

15 лютага супрацоўнікі аддзела эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры правялі дзень інфармацыі для навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага тэхнічнага каледжа.

16 лютага ў аддзеле краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі пачала дзейнічаць выстава, прысвечаная жывапісцу, народнаму мастаку БССР *Міхаілу Андрэевічу Савіцкаму*.

27 лютага супрацоўнікі сектара замежнай літаратуры правялі дзень інфармацыі для навучэнцаў Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа.

Віцебская гарадская сетка публічных бібліятэк

У бібліятэцы імя Я. Маўра г. Віцебска адкрыта выстава работ, удзельнікаў конкурсу на лепшы алімпійскі вымпел, які арганізавалі Прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэту ў Віцебскай вобласці сумесна з упраўленнем адукацыі аблвыканкама.

Народнае слова. – 2012. – 7 лют. – С. 3.

13 лютага ў бібліятэцы імя У. І. Корбана прайшла

сустрэча з удзельнікамі народнага літаратурна-музычнага клуба “Выток” пад назвай “Мову родную шануйце”. Наведвальнікі прымалі актыўны ўдзел у размове пра родную мову, слухалі вершы мясцовых аўтараў.

Лёзненская раённая сетка публічных бібліятэк

У дзіцячай бібліятэцы да Дня роднай мовы была падрыхтавана і працавала на працягу месяца кніжная выстава “Па дарогах і сцяжынках мовы”.

6 лютага бібліятэка аграгарадка “Пушкі” запрасіла дзяцей і падлеткаў на гутарку-роздум “Знакавая постаць Беларусі” (да 130-годдзя са дня нараджэння Я. Купалы).

17 лютага адбылося знаёмства чытачоў бібліятэкі аграгарадка “Крынкі” з кнігай А. Салтука “Дзве зары”.

Міёрская раённая сетка публічных бібліятэк

17 лютага ў Міёрскай цэнтральнай бібліятэцы адбылося чарговае пасяджэнне клуба “Бажэна” пад назвай “Юбілейны экспрэс”, прысвечанае 10-годдзю са дня стварэння аб’яднання.

У **лютым** ў Міёрскай дзіцячай бібліятэцы праведзена літаратурнае падарожжа “Прыгоды ў краіне беларускай кнігі”.

Пастаўская раённая сетка публічных бібліятэк

22 лютага ў Пастаўскай раённай бібліятэцы быў праведзены дзень тэорыі і практыкі “Конфликтные ситуации в библиотеке или Эффект исцеляющего слова”. На сустрэчу з бібліятэкарамі Пастаўскай ЦБС быў запрошаны псіхолаг раённай бальніцы *Алена Уладзіміраўна Хмяльніцкая*.

14 лютага чытальная зала ЦРБ запрасіла навучэнцаў каледжа разам адзначыць Дзень закаханых. Літаратурна-музычная вечарына “Как они любили!..” не пакінула нікога абыякавым. Бібліятэкары прапанавалі гасцям гульні, гучалі вершы пра каханне, навучэнцы бралі актыўны ўдзел у правядзенні вечарыны.

Полацкая раённая сетка публічных бібліятэк

2 лютага ў Ветрынскай гарпасялковай бібліятэцы для вучняў малодшых і сярэдніх класаў прайшла гадзіна экалогіі “Цудоўны дар прыроды”, на якую былі запрошаны супрацоўнікі музея экалогіі г. Полацка .

8 лютага літаратурная гадзіна да Дня юнага героя-антыфашыста “Зачем ты, война, у мальчишек их детство украла?’’ была падрыхтавана ў Фарынаўскай бібліятэцы для вучняў малодшых і сярэдніх класаў.

У Саланіцкай бібліятэцы-клубе **16 лютага** адбылося свята “Гарбата з водарам мяты”, на якое былі запрошаны медыцынскія

душы”, што працуе пры Глыбоцкай раённай бібліятэцы, прайшоў вечар-успамін “Ён любіў Беларусь нашу мілую”, прысвечаны 55-годдзю са дня нараджэння паэта *Алеся Пісьмянкова*.

Веснік Глыбоччыны. – 2012. – 22 лют. – С. 7.

Докшыцкая раённая сетка публічных біліятэк

У дзіцячай раённай бібліятэцы **19 лютага** ладзілася літаратурная сустрэча “Духовных книг божественная мудрость” з членамі літаратурнай гасцінай “Воскресение”, якая дзейнічае пры духоўна-асветніцкай газеце “Воскресение”. У праграме сустрэчы: знаёмства з творчасцю галоўнага рэдактара газеты *А. Міхаленка,* прэзентацыя яе праваслаўных кніг. Падчас сустрэчы гучалі вершы і песні пад гітару духоўнай тэматыкі ў выкананні акцёра тэатра і кіно *Яўгена Піменава.*

Цэнтральная раённая бібліятэка запрасіла на ўрок гістарычнай памяці “Памяць і боль Афганістана”, прымеркаваны да Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. Мерапрыемства было арганізавана для наведвальнікаў дзённага аддзялення прыбывання інвалідаў. Былі запрошаны воіны-інтэрнацыяналісты, якія падзяліліся ўспамінамі пра той нялёгкі час.

Дубровенская раённая сетка публічных бібліятэк

У цэнтральнай раённай бібліятэцы ў **лютым** прайшоў музычна-паэтычны вечар для вучняў старэйшага школьнага ўзросту “Все начинается с любви”, а для чытачоў Ляднянскай сельскай бібліятэкі адбыўся ўрок мужнасці “Афганістан баліць ў маёй душы” і літаратурная гульня па кнізе *В. Катаева* “Цветик-семицветик”.

Лепельская раённая сетка публічных бібліятэк

9 лютага ў інфармацыйным цэнтры “Скарбніца здароўя” цэнтральнай раённай бібліятэкі прайшла гадзіна для людзей сталага ўзросту “Шляхі-дарогі ў краіну здароўя”. Карысныя парады давала правізар цэнтральнай аптэкі Л. У. *Занько.*

14 лютага прайшлі чарговыя заняткі ў бібліяграфічным ліцэі на тэму “Периодические издания для молодёжи”. Навучэнцаў пазнаёмілі з найбольш цікавымі публікацыямі ў перыядычных выданнях.

14 лютага ў галерэі “Арт-Лепель” прайшло адкрыццё выставы графікі “Зямля бацькоў” навучэнцаў Дзіцячай школы мастацтваў.

23 лютага ў клубе “Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь” прайшла гульня-вандроўка “Маё здароўе ў маіх руках”. Слухачоў пазнаёмілі з тымі небяспечнасцямі, якія падпільноўваюць нас па жыцці. Мерапрыемства суправаджалася праглядам мастацкага фільма “Капелька любви”.

28 лютага ў клубе “Добрыя сустрэчы” адбыўся вечар-

літаратурна-мастацкая гадзіна пад назвай “Люблю за то, что с ней добрей становится душа”, прымеркаваная да Дня святога Валянціна.

Народнае слова. – 2012. – 21 лют. – С. 7.

15 лютага ў дзіцячай бібліятэцы імя Я. Маўра прайшоў урок мужнасці “3310 дзён і начэй Афганістана”.

15 лютага ў бібліятэцы імя П. Броўкі адбылася творчая сустрэча з акцёрамі Беларускага тэатра “Лялька”, у якой бралі ўдзел *Ніна Шабанава, Юрый Франкоў, Алег Рыхтар, Ганна Сцепанец.* Дзецям было прапанавана тэатралізаванае прадстаўленне “Батлейка”.

http://libsystem.vitebsk.ws/

17 лютага ў бібліятэцы імя І. Крылова прайшла гадзіна мастацтва “Летапісец людскіх лёсаў”, прысвечаная 90-годдзю са дня нараджэння народнага мастака Беларусі М. Савіцкага.

21 лютага мультымедыйная прэзентацыя і гутарка да Дня роднай мовы “У сузор’і роўных” адбылася ў бібліятэцы імя Еўфрасінні Полацкай**.**

Полацкая гарадская сетка публічных бібліятэк

90-годдзю са дня нараджэння знакамітага беларускага мастака *Міхаіла Савіцкага* была прысвечана арт-гадзіна ў цэнтральнай бібліятэцы імя Ф. Скарыны, якая адбылася **1 лютага.**

2 лютага для пажылых чытачоў у цэнтральнай бібліятэцы імя Ф. Скарыны прайшла гадзіна карыснай інфармацыі “Расширяем горизонты общения”. Работнікі бібліятэкі паведамілі пенсіянерам як з дапамогай інтэрнэту і сацыяльных сетак можна пашырыць прастору камунікацыі.

У бібліятэцы імя Я. Купалы ў межах праграмы “Мой горад – Радзімы часцінка”, прымеркаванай да 1150-годдзя са дня нараджэння Полацка, адкрылася выстава-галерэя Ганаровых грамадзян г. Полацка “Іх імёны будуць прыкладам усім”. На ёй прадстаўлены фотаздымкі Ганаровых грамадзян г. Полацка з 1967 г. па 2011 г.

Полацкі веснік. – 2012. – 3 лют. – С. 23.

17 лютага ў літаратурна-музычнай гасцёўні “Под сенью духовности” (бібліятэка імя Я. Купалы) узгадвалі герояў Айчыннай вайны 1812 года. У межах музычна-паэтычнай вечарыны “Вы, чьи широкие шинели напоминали паруса…” гучаў даклад “Жизнь и подвиг Якова Кульнева” магістранта ПДУ *В. Шыпілы*, паведаміў пра жыццё Дзяніса Давыдава вучань СШ №10 *І. Пятровіч*, свае песні на вершы *Д. Давыдава*, а таксама музычныя творы Б. Акуджавы праспявала паэтэса і бард *Л. Мяхедка*.

Развітацца з зімой запрашала бібліятэка імя А. Герцэна. Народнае свята “А мы Масленицу встречали” **26 лютага** сабрала

членаў клуба “Я - палачанін”.

Аршанская раённая сетка публічных бібліятэк

15 лютага ў Вусценскай сельскай бібліятэцы прайшла вечарына-ўшанаванне “Жывая памяць”, прысвечаная Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

21 лютага ў цэнтральнай раённай бібліятэцы адбылася літаратурная вечарына “Вобразная, вольная, пявучая, мова беларуская мая”, прысвечаная Дню роднай мовы. На мерапрыемстве прайшла прэзентацыя вершаванага зборніка мясцовых самадзейных паэтаў.

22 лютага Андрэўшчынская сельская бібліятэка запрасіла на гістарычнае падарожжа, прысвечаннае Дню абаронцаў Айчыны “Даніна святым традыцыям”.

Бешанковіцкая раённая сетка публічных бібліятэк

Літаратурны візіт “Я сёння хачу разам з вамі…” адбыўся **16 лютага** ў чытальнай зале раённай бібліятэкі. На мерапрыемства былі запрошаны аматары паэзіі.

Сустрэча з мясцовай паэткай *Н. Бондар (Галавач)* прайшла з нагоды выхаду ў свет зборніка яе вершаў пад назвай “На возеры Белым”. На мерапрыемстве прагучалі вершы ў выкананні аўтара і песні на яе вершы і музыку.

26 лютага бібліятэкары сістэмы прынялі актыўны ўдзел у раённым свяце “Масленіца”. На мерапрыемстве Бешанковіцкая ЦБС прадстаўляла беларускую народную кухню.

Браслаўская раённая сетка публічных бібліятэк

У чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі г. Браслава для вучняў малодшых класаў адбылося літаратурнае знаёмства з творчасцю беларускага пісьменніка *Міколы Маляўкі* “Дзе жывуць казкі” з мультымедыйнай прэзентацыяй, а для вучняў старэйшых класаў СШ № 2 была праведзена інфармацыйная гадзіна “Журналы и газеты – вопросы и ответы”.

Браслаўская звязда. *– 2012. – 11 лют. – С. 3.*

З **6 па 12 лютага** ў дзіцячай бібліятэцы прайшоў тыдзень прафарыентацыі, да якога была падрыхтавана выстава-рэкамендацыя “Жыццё аднаўляе прафесіі”, а таксама інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Будущая профессия: мечта или реальность”.

16 лютага ў Ахрэмаўскай бібліятэцы адбылася літаратурная вечарына “Беларус, роднай мовы сваёй не цурайся” і выстава-прысвячэнне “Гучы, мая родная мова”, падрыхтаваныя да Дня роднай мовы.

З **13** па **19 лютага** Браслаўская цэнтральная раённая бібліятэка правяла з чытачамі тыдзень воінскай славы, у рамках

якога адбылася сустрэча з удзельнікам афганскіх падзей *Анатолем Міласердавым*, падрыхтавана тэматычная літаратурная выстава, праведзена гадзіна-рэквіем пад назвай “Афганскі боль”.

Народнае слова. – 2012. – 16 лют. – С. 2.

21 лютага ў цэнтральнай раённай бібліятэцы прайшоў круглы стол, на якім былі разгледжаны вынікі работы бібліятэк за 2011 год.

З **21 лютага** на Браслаўшчыне стартавала месячная акцыя “Чытаем на беларускай мове”, мэта якой прыцягнуць увагу мясцовага насельніцтва, асабліва дзяцей і моладзі, да беларускага слова.

Народнае слова. – 2012. – 21 лют. – С. 7.

Верхнядзвінская раённая сетка публічных бібліятэк

3 лютага ў Верхнядзвінскай раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя кнігі “Последний комиссар”, аўтарам якой з’яўляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі, ураджэнец Верхнядзвінскага раёна, былы камандзір падводнай лодкі *Васілій Іосіфавіч Руды*.

12 лютага ў Лявонішанскай бібліятэцы да Дня святога Валянціна праведзена літаратурна-музычная кампазіцыя “Пусть миром правит лишь любовь”.

14 лютага ў Асвейскай бібліятэцы адбыўся літаратурна-музычны вечар “Всё начинается с любви”.

15 лютага бібліятэкар Сар’янскай бібліятэкі *А. Бубала* арганізавала фэст-рэквіем “Будет сердце жечь Афганистан и в объятьях Родины своей”.

Гарадоцкая раённая сетка публічных бібліятэк

14 лютага ў Гарадоцкай цэнтральнай бібліятэцы прайшоў дзень інфармацыі “День новой книги”. Мерапрыемства прысвечана аб’яўленаму ў Беларусі Году кнігі.

Глыбоцкая раённая сетка публічных біліятэк

17 лютага ў Шунеўскай сельскай бібліятэцы для членаў клуба “Нашчадкі” праведзена фальклорная гадзіна “По церковному преданью, по народному поверью”, прысвечаная зімовым і веснавым святам і абрадам царкоўнага і народнага календара.

18 лютага для чытачоў Удзелаўскай сельскай бібліятэкі была падрыхтавана гадзіна мастацтва з відэапрэзентацыяй “Поклонимся огню его сердца”, прысвечаная 90-годдзю са дня нараджэння вядомага беларускага мастака *М. Савіцкага*.

25 лютага супрацоўнікі Глыбоцкай дзіцячай бібліятэкі прапанавалі гадзіну інфармацыі з відэапрэзентацыяй “Нет на свете чуда интереснее, чем книга”. Дзеці даведаліся шмат цікавых звестак пра першыя кнігі, пра з’яўленне кнігадрукавання.

26 лютага ў літаратурна-музычнай гасцёўні “Сустрэчы для